Раённая масавая газета. Заснавана 24 сакавіка 1935 года

# Добрушскі край

23 мая 2018 года
Серада

№37 (10758)

УРАДЖАЙ-2018

# Кожная хвіліна – дарагая



**Сухое надвор'е, якое ўсталявалася на працягу апошняга месяца, запатрабавала ад хлебаробаў сельгаспрадпрыемства ААТ "Жгунскае" аператыўных дзеянняў. Сяўбу кукурузы ў гаспадарцы даверылі вопытнаму механізатару Вячаславу Цімашкову. Ён больш за 20 гадоў прысвяціў рабоце на зямлі. Гатунак "Любава" беларускай селекцыі добра заявіў аб сабе на землях гаспадаркі.**

– Справу сваю ведаю,– гаворыць Вячаслаў Цімашкоў. – Спадзяюся на добры ўраджай кукурузы. Хаця, многае будзе залежаць ад надвор'я.

Не паспела сонца ўзняцца над зямлёй, Вячаслаў ужо ў полі. Глеба да сяўбы падрыхтавана, унесены неабходныя мінеральныя ўдабрэнні. Каб даць апошнія ўказанні па правядзенні работ, на поле прыехаў галоўны аграном Павел Шаронаў. Па словах спецыяліста, кукуруза – універсальны корм для дойнага статка і жывёлы на адкорме.

– На жаль, у мінулым годзе з ураджаем кукурузы не склалася, толькі 270 цэнтнераў з гектара, – кажа Павел Віктаравіч.

Сёлетнія прагнозы – не менш за 350 цэнтнераў з гектара. Пад культуру адведзена плошча ў 1800 гектараў. Сяўба пачалася напрыканцы красавіка. Завяршыць яе тут плануецца 28 мая. Некалькі дзён таму, каб паскорыць тэмпы сяўбы, задзейнічалі з трактарам яшчэ адзін пасяўны агрэгат.

– Захаванне аптымальных тэрмінаў сяўбы павінна адбіцца на развіцці культуры, яе ўраджайнасці, – гаворыць галоўны аграном.

Механізатары забяспечаны ўсім неабходным: адзеннем, інструментамі. На месца правядзення работ дастаўляецца гарачае харчаванне.

**Леанід ДУБОЎСКІ**
**Фота Яўгена УСЦІНАВА**

## Весткі з месцаў

### Экзамен – аўдытам

**Добрушскі фарфоравы завод паспяхова вытрымаў сацыяльны аўдыт SMETA (Sedex Member Ethical Audit).**

Адзнака выстаўлялася па чатырох асноўных паказчыках: ахове працы і вытворчай бяспецы, умовах працы работнікаў і дзелавой рэпутацыі пастаўшчыка.

Па словах вядучага спецыяліста завода па маркетынгу Марыны Зайцавай, эксперты ўважліва вывучылі дакументацыю, тэхналагічныя аспекты вытворчасці, правялі маніторынг сярод рабочых і спецыялістаў прадпрыемства. Па-за ўвагай аўдытараў не засталіся падыходы дабрушан у бяспецы працы і ахове навакольнага асяроддзя. Па ўсіх параметрах праверкі фарфарысты атрымалі ад міжнародных экспертаў высокую адзнаку.

**Леанід МІНІЧ**

### І музыкай, і словам

**Добрушскі паэт-песеннік Сяргей Старыкаў прыняў удзел і атрымаў дыплом лаўрэата фестывалю аўтарскай песні "Зялёны Гран-пры".**

Ён штогод праходзіць на Гродзеншчыне. На тэрыторыі санаторыя "Купалінка" свае творчыя здольнасці дэманстравалі эстонцы, латвійцы, расіяне і беларусы. У праграме фестывалю – творчыя майстэрні, конкурсы, міні-канцэрты. На адным з такіх канцэртаў аматар музыкі і прэзентаваў сваю праграму.

– Заявіўся адразу ў трох намінацыях, – расказвае ён. – Як паэт, выканаўца і аўтар музыкі.

**Сяргей ВОЛЬГІН**

### Творчасць навобмацак

**Дабрушане Валянціна Дрынеўская, Таццяна Галушкіна і Дзмітрый Грудавенка прадставілі раённую арганізацыю інвалідаў па зроку на IX абласным парафестывалі "Па старонках памяці", што прайшоў у гарпасёлку Уваравічы Буда-Кашалёўскага раёна.**

Жанчыны арганізавалі ў фае гарадскога Дома культуры асабістую выставу дэкаратыўна-прыкладной творчасці. На ёй былі лепка з салёнага цеста і карціны з яго, экспанаты з лазы, дрэва. Асаблівую цікавасць наведвальнікаў фестывалю прыцягнулі лялькі-абярэгі дабрушанак.

Ацанілі ва Уваравічах і музычны талент баяніста Дзмітрыя Грудавенкі.

**Вольга ГЛЫЗІНА**

ISSN 2073-1000

## Погода

Долгота дня 16.19
Луна
23 мая — в Деве,
24, 25 — в Весах

Первая четверть

**24 мая**
НОЧЬЮ +14…+15
ДНЕМ +22…+24
Переменная облачность.
Без осадков.
Ветер северный, 2-4 м/с

**25 мая**
НОЧЬЮ +12…+15
ДНЕМ +21…+23
Переменная облачность.
Без осадков.
Ветер с.-восточный, 3-5 м/с

ПРЯМАЯ ЛИНИЯ

# Реагировать действием

**Отсутствие пешеходной дорожки, неудобные лавочки, мусор на плотине – вопросы, поднятые в ходе прямой телефонной линии с заместителем председателя райисполкома Сергеем ПЕТРОВСКИМ.**

Жители одного из многоквартирных домов с улицы Полевой остались недовольны качеством скамейки, установленной у их подъезда.

– Чтобы комфортно сидеть, нужно опереться на спинку, ее у скамейки нет. Для пожилых это крайне неудобно, – рассказала добрушанка Вера Чубарева.

Вопрос пенсионерки Сергей Петровский адресовал «Добрушскому коммунальнику». Руководитель организации пообещала решить его в ближайшее время.

К коммунальщикам ушли и другие обращения граждан. К решению проблемы по уборке мусора на плотине, на которую жаловались с улицы Декабристов, приступили практически мгновенно. Заместитель председателя райисполкома еще принимал обращения добрушан, а коммунальщики уже начали убирать ветки с берега Ипути.

А вот с решением проблемы, волнующей жительницу дома №15 по проспекту Мира, придется подождать. Как минимум, до осени.



– Страшно смотреть в окно, – сетовала в телефонную трубку жительница дома Раиса Сныткина. – Тополя во дворе нуждаются в срочной обрезке.

Как выяснилось, проводить подобные работы в летнее время нельзя. Сезон наступит в октябре, когда деревья будут находиться в состоянии покоя.

Один из часто задаваемых вопросов на горячей линии – качество дорог. В этот раз его озвучили дачники. Дорожной службе Сергей Петровский адресовал вопрос о грейдировании участка дороги от ДРСУ-150 до так называемого «вороньего поля», где расположены приусадебные участки.

Ни одно из обращений не осталось без внимания. К решению каждой поднятой по телефону проблемы подключены соответствующие службы района.

**Наталья ВАСИЛЬЕВА**
**Фото Евгения УСТИНОВА**

АГРАРНЫЙ СЕКТОР

# Витамины для буренки

**Зеленую подкормку животным в сельхозпредприятии «Крупец» начали давать одними из первых в районе. Сезонное блюдо в это время года составляет основу рациона буренок. И к этому, признаются аграрии, их подтолкнули опустевшие силосные траншеи.**

– К тому же погода позволила травам быть в хорошей «форме», – рассказала исполняющая обязанности главного агронома сельхозпредприятия Наталья Билотос. – В этом году убираем с недавно заложенного пастбища люцерну. Сорт подобрали с хорошими рекомендациями, российской селекции. В наших силах обеспечить и соответствующий уход, при котором травы будут давать хороший урожай около 8 лет.

Травы в КСУП «Крупец» занимают более 500 гектаров. Для создания достойной кормовой базы в этом году местные аграрии готовят своего рода творческий эксперимент.

– Сбалансировать корм можно с помощью подбора компонентов трав. Хотим попробовать пропорцию из 15 килограммов семян люцерны и 3,5 – тимофеевки. Такое соотношение позволит быстро наращивать зеленую массу и обеспечивать животных необходимым количеством протеина.

Кормоуборочный КВК-800 выходит в поле на заре. Время для аграриев сейчас – категория значимая. Ведь рабочие руки нужны на многих сельскохозяйственных работах. Есть у Натальи Билотос и другие подсказки, когда нужно поспешить в поле: ежа выпустила метелку, а клевер вступил в фазу бутонизации.

– Уборка трав первого укоса – событие не менее важное, чем жатва. Это в итоге и привесы, и удои, и благополучие хозяйства в целом, – отмечает руководитель Елена Можанова. – Поэтому перед нами стоят непростые задачи.

**Наталья ХОДУНЬКОВА**

СЕМІНАР

# Як нараджаецца малако

**Актуальным пытанням пераводу жывёлы на летне-пашавае ўтрыманне быў прысвечаны абласны семінар, які прайшоў на базе нашага раёна. Удзел у ім прынялі наменнікі начальнікаў упраўленняў сельскай гаспадаркі і харчавання райвыканкамаў, галоўныя заатэхнікі-селекцыянеры з раёнаў Гомельшчыны.**

– Добрушчына апошнія пяць год – лідар у вобласці па ўзнаўленні статка, – гаворыць намеснік начальніка ўпраўлення сельскай гаспадаркі і харчавання райвыканкама Валянціна Кляцко. – Як арганізавана гэта работа ў летнія месяцы, якія тут створаны ўмовы ўтрымання жывёлы – сваім вопытам мы вырашылі падзяліцца з калегамі.

Госці наведалі гаспадаркі, якія ў раёне паказваюць прыклад па многіх паказчыках. У сельгаспрадпрыемстве "Калінінскі" расказалі аб асаблівасцях арганізацыі пераводу жывёлы на летне-пашавае ўтрыманне.

– Цяпер тут атрымліваюць больш за 21 літр малака ад каровы ў суткі, амаль на 3 больш чым у сярэднім па раёне, – заўважае Валянціна Кляцко. – У многім такую прыбаўку атрымалі за лік правільнай арганізацыі кармлення. У пасевы шматгадовых траў дадалі зерневыя культуры.

У "Калінінскім" ёсць чаму павучыцца і ў стацыянарным утрыманні жывёлы. Цяпер "зялёнка" складае палову сутачнага рацыёну буйной рагатай жывёлы ў гэтай гаспадарцы.

Ад тэхналогіі кармлення і атрымання прадукцыі не адступаюць і ў лагеры кругласутачнага ўтрымання жывёлы "Жгунскага". На прыкладзе гаспадаркі гасцям паказалі, як пастаўлена работа па ўзнаўленні статка ў летнія месяцы.

**Тацццяна АХРАМЕНКА**

ЭКСПРЕСС-ОПРОС

# Новость, которая «зацепила»

*Спорт, политика, законотворчество… Какие новости в стране и в мире запомнились людям разных возрастов и профессий? Об этом корреспондент «ДК» поинтересовалась на улицах города.*



**Владимир КОЛЕСНИКОВ, работник бумажной фабрики:**

– Внуки приехали – вот моя главная новость. Живут далеко, во Франции, приезжают раз в год. А если серьезно, давно понял: от меня в событиях мирового масштаба зависит немного. Из новостей районного уровня хочу отметить работу коммунальщиков. В городе чисто. В семь утра иду на работу, а они уже трудятся. Наконец, начали укладывать асфальт на улицах. Для многих горожан это приятное событие.



**Елена КАЛИСТРАТОВА, продавец:**

– Новости слушаю едва ли не ежечасно, в магазине весь день работает радиоприемник. Но не все они мне интересны. В основном запоминаются хорошие. Например, о бракосочетании представителей королевской семьи в Англии или о рождении очередного наследника на британский престол.



**Нина РОМАНЮК, пенсионерка:**

– Последние несколько лет больше всего меня волнуют новости, касающиеся конфликта в Украине. Он затрагивает интересы моих близких людей. Недалеко от Донецка живет мой сын с семьей. За них и болит сердце.



**Сергей АНДРЕЕВ, гость Добруша:**

– Для меня главные новости последних дней – спортивные. Следил за играми Чемпионата мира по хоккею. Шведы – чемпионы, а швейцарцы, которых поначалу и в расчет никто не брал, обладатели серебра. Болел, конечно, за россиян. Хотя в этот раз они остались без медали.

Одним из самых обсуждаемых тем считаю и вопрос о введении системы штрафных баллов для водителей. По этому поводу у меня свое мнение. Ведь если их действительно введут, получится, что за одно нарушение водителя будут наказывать дважды.

**Спрашивала**
**Ирина КОЛОСОВА**
**Фото автора**

НА СВЯЗИ

**26 мая с 9.00 до 12.00**
**по телефону 3-00-00**
прямую телефонную линию с жителями района проведет Юрий Николаевич ДЕРКАЧЕВ, первый заместитель председателя райисполкома, начальник управления сельского хозяйства и продовольствия райисполкома.

* * *

**25 мая с 11.00 до 12.00**
**по телефону 3-30-53**
пройдет прямая телефонная линия с участием Елены Александровны ЗЕЛЕНКОВОЙ, начальника Добрушского районного отдела Гомельского областного управления фонда социальной защиты населения.

В ЦЕНТРЕ ВНИМАНИЯ

# Партнерство не на словах

**Президент Беларуси Александр Лукашенко считает необходимым подвергнуть ревизии отношения Беларуси с Эквадором.**

Об этом он заявил на встрече с министром иностранных дел Эквадора Марией Фернандой Эспинosой Гарсес, которая посетила с официальным визитом Беларусь.

«У нас в отношениях с Эквадором такой период, когда надо было бы подвергнуть ревизии наши отношения, посмотреть, что у нас получилось, может быть, от чего-то отказаться и наметить план действий на ближайшую перспективу», – сказал Глава государства.

Александр Лукашенко отметил, что в Эквадоре в последнее время произошли определенные политические реформы, и они еще не закончены. Основой взаимоотношений Беларуси и Эквадора, соответствующей дорожной карты должно стать торгово-экономическое сотрудничество. «Думаю, в наших планах мы это возьмем за основу. Но согласитесь, что нам не стоит брать на себя обязательства, которые мы не сможем выполнить. Ни Эквадор, ни Беларусь. Поэтому и нужна ревизия всего сделанного и старых планов», – отметил Глава государства.

Президент констатировал, что у Беларуси с Эквадором сложились хорошие политические отношения. Страны имеют схожие позиции по международной повестке, хорошо сотрудничают во всех международных организациях, особенно в ООН.

# В странах ЕС – новые послы

**Президент Беларуси Александр Лукашенко назначил новых послов в странах Евросоюза.**

Чрезвычайным и Полномочным Послом Беларуси в Швеции назначен Дмитрий Мирончик. Александр Лукашевич назначен на пост Чрезвычайного и Полномочного Посла Беларуси в Болгарии и по совместительству в Греции и Республике Кипр. Чрезвычайным и Полномочным Послом Беларуси в Эстонии назначен Вячеслав Качанов. Кроме того, Владимир Астапенко, посол Беларуси в Аргентине и по совместительству в Уругвае, назначен послом в Чили по совместительству. Посол Беларуси в Индонезии и по совместительству в Малайзии, Сингапуре и Филиппинах Валерий Колесник также будет работать в должности постоянного представителя Республики Беларусь при Ассоциации государств Юго-Восточной Азии (АСЕАН) по совместительству.

**По материалам БелТА**